Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (106), 2018

*УДК 069:929*Ф.Скарына*

# Навуковая канцэпцыя дзяржаўнага музея Францыска Скарыны (праект, скарочаны варыянт)

К.С. Усовіч

Падаецца скарочаны варыянт праекта навуковай канцэпцыі будучага дзяржаўнага музея Францыска Скарыны.
**Ключавыя словы:** асвета, беларускі народ, вялікі сын беларускага народа, канцэпцыя, кнігадрукаванне, культура, культурная спадчына, музей, музейны фонд, Рэспубліка Беларусь, Францыск Скарына, скарыназнаўства, экспазіцыя.

A shortened version of the draft scientific concept of the future state museum of Francisk Skaryna is given.
**Keywords:** Belarusian nation, great son of the Belarusian people, book printing, concept, culture, cultural heritage, museum, museum fund, education, Republic of Belarus, Francisk Skaryna, skorinovedenie, exposition.

Музеі нашай рэспублікі – гэта важнейшыя спецыялізаваныя ўстановы матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа і дзяржавы. Створаныя на строга навуковай і аб‘ектыўнай аснове, яны вылучаюць, вывучаюць, захоўваюць і шырока прапагандуюць рэчы, дакументы, матэрыяльныя носьбіты інфармацыі і саму інфармацыю, іншыя самых розных відаў і родаў экспанаты, якія наглядна паказваюць паступальны рух у развіцці матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа, на прыкладзе лепшых устаноў, сыноў і дачок беларускага народа вучаць цяперашняе і будуць вучыць наступныя пакаленні жыхароў Рэспублікі Беларусь найбольш правільнаму і хуткаму руху па шляху прагрэсу, прывіваюць любоў да сваёй Радзімы, гордасць за свой родны край, сваіх лепшых землякоў.

Мінулы год прайшоў пад засенню 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, пачатага вялікім сынам беларускага народа Францыскам Скарынам. Побач з ранейшымі юбілеямі і самога Ф. Скарыны, і беларускага кнігадрукавання гэты яшчэ больш узвысіў нашага першадрукара, усе мы яшчэ паўней і глыбей зразумелі яго ўклад у развіццё важнейшых аддзелаў культуры беларускага народа – і адукацыі, і навукі, і мовы, і літаратуры, і мастацтва, і ў цэлым усёй культуры. Асоба Скарыны ў нашых вачах стала яшчэ больш светлай і велічнай.

Неабходнасць стварэння дзяржаўнага музея Ф. Скарыны намі ўпершыню была пастаўлена яшчэ ў 1996 г. [1, с. 3]. Розныя іншыя пытанні стварэння і ўдасканалення музея-лабараторыі Ф. Скарыны ГДУ імя Ф. Скарыны аўтарам у ророзны час таксама падымаліся ў друку [2], [3].

Каб наглядна, поўна, аб‘ектыўна, правільна і шырока адлюстраваць жыццёвы і творчы шлях Ф. Скарыны, палітычныя, культурныя і бытавыя ўмовы і фон, у якіх пралёг яго гераічны і самаахвярны шлях, неабходна навуковая канцэпцыя. Важнасць і неабходнасць такіх канцэпцый выпрацавала шматвяковая сусветная практыка арганізацыі і стварэння музеяў. Першая наша спроба стварыць такую канцэпцыю для Скарынаўскага музея была зроблена ў 2011 г. [2, с. 62]. З больш поўным варыянтам нашай канцэпцыі чытачоў газеты творчай інтэлігенцыі Рэспублікі Беларусь «Літаратура і мастацтва» 27 снежня 2017 г. пазнаёміла яе карэспандэнт Дар‘я Чарняўская [4, с. 5].

Як правіла, навуковая канцэпцыя музея складаецца з наступных раздзелаў: І. Аналітычная частка; ІІ. Навуковая прапрацоўка праблемы: аналіз калекцыйнага, помнікавага і навукова-гістарычнага патэнцыялу музея; забяспечанасць будучай экспазіцыі прадметным матэрыялам; месца экспазіцыі сярод экспазіцый той жа профільнай групы і ў музейнай сетцы рэгіёна, рэспублікі, свету; ІІІ. Праектная частка: абгрунтаванне тэмы экспазіцыі; мэты, задачы, асноўныя прынцыпы і метады яе пабудовы; IV. Структура, мяркуемая аўдыторыя музея; V. Асноўныя патрабаванні да мастацкай канцэпцыі.

**І. Аналітычная частка.**

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Як раней пісалася, «развіццё беларускай і ўсходнеславянскай культуры атрымала, дзякуючы Ф. Скарыну, новае паскарэнне. Ён праславіў беларускі народ перад усім светам, зрабіў тагачасную беларускую мову мовай кнігадрукавання, трывала замацаваў сінтаксічныя, марфалагічныя, фанетычныя, лексічныя і арфаэпічныя нормы, надаў ёй большую ўстойлівасць у грамадскім жыцці. Скарына ў пантэоне сыноў беларускага народа займае самае ганаровае месца. Іншымі словамі, ён – самая значная постаць сярод усіх беларусаў усіх часоў. Ён з'яўляецца славай і гонарам усяго нашага народа» [2, с. 62].

У культурнай грамадскасці нашай рэспублікі ўжо даўно вітае ідэя аб неабходнасці па вартасці, яшчэ больш поўна ацаніць жыццёвы подзвіг першадрукара – адкрыць яму самы галоўны і відовішчны помнік – дзяржаўны музей. У рэспубліцы шмат самастойных музеяў вялікіх нацыянальных герояў (пісьменнікаў і мастакоў, дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў). Большасць з іх пакінулі вялікі след у 1–2 галінах дзейнасці. Дык чаму няма такога музея чалавеку, які, па сутнасці, стаяў ля вытокаў многіх галін жыцця нашага народа? Скарына стаў самай красамоўнай візітнай карткай нашай дзяржавы. Ён увекавечаны ў мастацтве (мастацкай літаратуры, выяўленчым і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве), у навуковай літаратуры, яму ўстаноўлена нямала помнікаў, яго імем названы вуліцы, установы і арганізацыі, у Рэспубліцы Беларусь устаноўлены 2 дзяржаўныя ўзнагароды (медаль і ордэн Францыска Скарыны).

У гэтым пераліку фактаў увекавечання памяці Ф. Скарыны няма, па сутнасці, самага галоўнага факта – сапраўднага, дзяржаўнага музея Ф. Скарыны (музей-лабараторыя нашага ўніверсітэта і на 10 % не замяняе такога музея). Якімі цяжкімі ні былі б цяперашнія фінансавыя і эканамічныя праблемы нашай рэспублікі, але яны не могуць быць прычынамі для эканоміі на музеі нашага вялікага культурнага і гістарычнага дзеяча. Як бы добра і поўна не была ўвекавечана памяць Ф. Скарыны, а толькі дзяржаўны музей яго зробіць гэтае ўвекавечанне ў цэлым здавальняючым. Скарына мільён разоў варты таго, каб наша дзяржава па поўнай вартасці ацаніла яго і выразіла яшчэ і такім фактам яму вялікую сваю ўдзячнасць і прызнанне.

З мэтай паскорыць прыход гэтага шчаслівага моманту мы і прапануем вашай увазе свой праект навуковай канцэпцыі дзяржаўнага музея Ф. Скарыны.

**ІІ. Навуковая прапрацоўка праблемы.**

У наш час значэнне кнігі вельмі вялікае. Яно не адразу стала такім, а паступова ўзрастала на працягу 9 стагоддзяў. Зразумела, што рост значэння кнігі залежаў ад адносін вышэйшага дзяржаўнага і царкоўнага кіраўніцтва, а таксама народа ў цэлым да гэтага вынаходства чалавецтва, ад узроўню эканамічнага развіцця дзяржавы і стану яе навукі і адукацыі (знешнія фактары) і ад якасці і колькасці кніг (унутраныя фактары).

Значэнне і велічнасць здзейсненага Скарынам у першай палове XVI ст. найбольш яскрава выяўляецца на фоне гісторыі Еўропы, Вялікага княства літоўскага, рускага і жамойцкага (ВКЛРЖ), гарадоў Полацка, Вільні, Кракава, Падуі, Прагі і іншых. Паколькі Скарына бываў ці не ў дзесятку гарадоў і ў столькі ж краінах, дык музейная экспазіцыя павінна адлюстраваць і ўзаемаадносіны гэтых краін паміж сабой і асабліва з ВКЛРЖ. Усё гэта павінна быць адлюстравана ў экспазіцыі прапарцыянальна: у найбольш агульным і кароткім плане: культурнае і палітычнае становішча Еўропы і еўрапейскага Адраджэння, гарадоў Падуі, Познані, Кёнігсберга; у больш шырокім і падрабязным плане: становішча ВКЛРЖ, узаемаадносіны апошняга з польскім каралеўствам і рускай дзяржавай; чэшскага каралеўства, прускага герцагства, гарадоў Кракава і Прагі; больш поўна і падрабязна – г. Полацка. Напрыклад, у паказе становішча гэтага горада трэба адлюстраваць карыстанне ім магдэбургскім правам, якое было ўведзена тут у 1498 г. Магдэбургскае права - гэта сістэма юрыдычных норм, якія прадастаўляюць гораду права на самакіраванне і стварэнне ўласных органаў улады і суда і вызначае прававое становішча гараджан.

**Аналіз калекцыйнага, помнікавага і навукова-гістарычнага патэнцыялу музея.**

У Рэспубліцы Беларусь, Расійскай Федэрацыі, рэспубліках Украіна і Польшча, у Чэшскай і Літоўскай рэспубліках маецца дастаткова калекцыйнага, помнікавага і навукова-гістарычнага патэнцыялу будучага музея, які ў Скарынаўскім музеі будзе прадстаўлены ў арыгіналах або копіях, муляжах, планшэтах і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Забяспечанасць будучай экспазіцыі прадметным матэрыялам.**

Акрамя кніг і артыкулаў, у якіх імя Ф. Скарыны ў любой форме выкарыстоўваецца ў загалоўках, у экспазіцыі павінны быць прадстаўлены і кнігі і артыкулы, дзе назвы выданняў, імя ці фота гравюрнага партрэта самога Скарыны ці яго выданняў выкарыстоўваюцца толькі ў тэксце [5, с. 200–207], [6, с. 194], [7, с. 54–55].

Прадстаўленне фотаздымкаў, даступных твораў у копіях і арыгіналах, біяграфічных звестак: а) вялікіх папярэднікаў Скарыны: Арыстоцеля, І. Гутэнберга, Ібн Рушда і іншых (намі выяўлена 47 персаналій), б) сваякоў і сяброў Скарыны (Я. Бабіча, Б. Онкава, Ю. Адверніка, М. Адвернік, бацькі Лукі і брата Івана, сына Сімяона і пляменніка Рамана), в) сучаснікаў і настаўнікаў Скарыны (Г. Венрайха, С. Герберштэйна, М. Каперніка і інш – 41), г) паслядоўнікаў (Ю. Даманеўскага, П. Святаполка, М. Чаховіца, В.М. Гарабурды, П. Мсціслаўца, І. Фёдарава і інш. – 30), д) мастакоў, скульптараў і мастацтвазнаўцаў, якія тварылі пра Скарыну (Э. Агуновіча, А.В. Александровіча, Э.Б. Астаф‘ева, І.О. Ахрэмчыка і інш. – 65), е) мовазнаўцаў (У.В. Анічэнкі, А.С. Будзіловіча, А.М. Булыкі, П.У. Уладзімірава, А.І. Жураўскага і інш. – 24), ж) пісьменнікаў, паэтаў і літаратуразнаўцаў (С.Х. Александровіча, П.А. Аляксеева, М.А. Багдановіча, З. Бядулі і інш. – 150), з) гісторыкаў, філосафаў і кнігазнаўцаў (М.А. Алексютовіча, Арыстоцеля, Э. Гендарсана і інш. – 57), і) работнікаў іншых галін і напрамкаў творчай дзейнасці (П.М. Захарчанкі, П.І. Кеппена, А.М. Курбскага і інш. – 33), к) 53-х вядомых дакументаў пра Скарыну (фрагмента метрыкі кракаўскага ўніверсітэта за 1504 г. са старонкай спісу першакурснікаў, актавага запісу гэтага ж універсітэта аб прысваенні Скарыну вучонай ступені бакалаўра за 1506 г., актавага запісу Падуанскага ўніверсітэта аб дапушчэнні Скарыны да экзамена на вучоную ступень доктара медыцыны за 1512 г. і інш.).

**Месца экспазіцыі сярод экспазіцый той жа профільнай групы і ў музейнай сетцы рэгіёна, рэспублікі, свету.** Экспазіцыя Скарынаўскага музея будзе займаць выключнае месца, паколькі гэта будзе адзіны ў свеце сапраўдны музей Скарыны.

**ІІІ. Праектная частка.**

**Абгрунтаванне тэмы экспазіцыі.**

Найбольш правільнай тэмай экспазіцыі бачыцца наступная: «Жыццёвы і творчы шлях беларускага і ўсходнеславянскага першадрукара і асветніка Францыска Скарыны». Для гэтай тэмы не патрабуецца абгрунтавання, таму што яна, па нашым перакананні, адназначна ахоплівае самую галоўную сутнасць праблемы, што павінна быць адлюстравана ў будучым музеі, і ўтрымліваецца ў шматлікай навуковай і навукова-папулярнай і даведачнай літаратуры. Адны толькі энцыклапедыі чаго значаць [3], [8].

**Мэты, задачы, асноўныя прынцыпы і метады яе пабудовы.**

Галоўнымі мэтамі стварэння дзяржаўнага музея Ф. Скарыны з‘яўляюцца: а) збор у адно месца ўсіх матэрыяльных носьбітаў, якія адлюстроўваюць увесь комплекс скарыназнаўства, раскрываюць выключна важную і карысную для беларускага народа шматгранную кнігавыдавецкую, навуковую і асветніцкую дзейнасць Ф. Скарыны на шырокім геаграфічным, сацыяльным, палітычным, айчынным і міжнародным фоне; б) захаванне і прымнажэнне іх для будучых пакаленняў; в) шырокая і шматгранная яе прапаганда; г) выхаванне на прыкладзе Скарыны высокаадукаваных, культурных і патрыятычна настроеных грамадзян Рэспублікі Беларусь, дружалюбных да беларускага народа прадстаўнікоў іншых народаў; д) увекавечанне памяці Ф. Скарыны; е) засведчанне ўдзячнасці беларускага народа свайму найвялікшаму сыну.

Задачы музея вынікаюць з адлюстраваных мэт – збіраць, захоўваць і прымнажаць матэрыялы творчай спадчыны Ф. Скарыны, прапагандаваць яе, дапамагаць асветніцкай сістэме РБ выхоўваць высокаадукаваных і самаадданых работнікаў усіх сфер жыцця і дзйнасці беларускага народа.

**Прынцыпы пабудовы музейнай экспазіцыі** [9].

Адным з асноўных з‘яўляецца сапраўдная і агульнапрызнаная навуковая канцэпцыя яе пабудовы. Экспазіцыя павінна быць пабудавана і на аснове такіх чатырох прынцыпаў, як: прынцып навуковасці, прынцып прадметнасці, камунікатыўна-інфармацыйны прынцып і прынцып канцэнтрычнасці. Прадстаўленая інфармацыя ў экспазіцыі павінна быць аб‘ектыўнай, навукова выверанай і абгрунтаванай; асноўнымі экспанатамі і асноўная іх колькасць павінны быць разнастайныя прадметы, якія і самі па сабе з‘яўляюцца прадметам музейнай экспазіцыі; прынцыпы даходлівасці і ўніверсальнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Прынцып навуковасці.** Асновой стварэння музейнай экспазіцыі з‘яўляецца навуковая канцэпцыя. У ёй фармулююцца мэты стварэння экспазіцыі, навуковае значэнне, цікавасць экспазіцыі для наведвальнікаў, апісанне экспазіцыі і памераў неабходных плошчаў, апісанне музейных прадметаў з уласнага збору ці магчымых запазычанняў з іншых музеяў, неабходныя затраты, патэнцыяльныя крыніцы фінансавання і падтрымкі, прыкладныя тэрміны стварэння экспазіцыі.

**Прынцып прадметнасці.** Музейны прадмет (экспанат) – гэта аснова ўнікальнасці кожнай экспазіцыі. Менавіта ад падбору музейных прадметаў залежыць пазнавальная каштоўнасць экспазіцыі, а таксама яе эмацыянальная накіраванасць. Такі экспазіцыйны паказ забяспечыць наведвальнікам магчымасць непасрэднага азнаямлення з музейнымі прадметамі.

**Прынцыпы даходлівасці і ўніверсальнасці.** Пры пабудове экспазіцыі як сродку масавай камунікацыі выкананне гэтых прынцыпаў з‘яўляецца абавязковым. Значную дапамогу ў гэтым акажа шматпланавасць падачы экспазіцыйных матэрыялаў. На першы план будуць вылучаны вядучыя экспанаты, астатнія як бы «прыглушацца», будуць адведзены на другі план і нават у «скрыты» план, змесяцца ў гарызантальнай вітрыне, турнікеце, альбоме, на высоўным шчыце і т.п. Будзе выкарыстана таксама спалучэнне «аблегчаных», агульнаступных зал, разлічаных на «сярэдняга» наведвальніка, і асаблівых зал, у якіх будуць створаны ўмовы для паглыбленай самастойнай работы наведвальнікаў. Для большай дасягальнасці экспазіцыі распрацуецца сістэма тэкстаў, фоназапісаў, а таксама наглядных навукова-дапаможных матэрыялаў. Вялікае значэнне будзе мець своеасаблівае эстэтычнае асяроддзе ва ўсёй экспазіцыі [4].

**IV.Структура, мяркуемая аўдыторыя музея.**

**I. Структура.**

1. Перадумовы для ўзнікнення кнігавыдавецкай і асветніцкай дзейнасці Ф. Скарыны. 2. Дзяцінства і юнацтва Скарыны, бацька і брат Іван. 3. Вучоба ў Кракаўскім (Ягелонскім) універсітэце. 4. Кнігавыдавецкая і асветніцкая дзейнасць Скарыны: у Празе, у Вільні. 5. Скарына ў паслякнігавыдавецкі перыяд (у Вільні, Пазнані, Кёнігсбергу, Празе). 6. Папярэднікі, сучаснікі і паслядоўнікі Ф. Скарыны. 7. Помнікі, мемарыяльныя дошкі Ф. Скарыны; вуліцы, арганізацыі, установы і дзяржаўныя ўзнагароды імя Ф. Скарыны;. 8. Вобраз Ф. Скарыны ў выяўленчым, дэкаратыўна-прыкладным і народным мастацтве, у навуковай і мастацкай літаратуры, музыцы і кіно. 9. Гісторыкі, філосафы, філолагі, псіхолагі, мастакі, пісьменнікі, паэты, драматургі і інш., якія стварылі шэдэўры інтэлектуальнай думкі пра Ф. Скарыну. 10. Фотаздымкі і кароткія біяграгфічныя звесткі дзеячаў сусветнай і беларускай культуры, узнагароджаных ордэнамі і медалямі Францыска Скарыны. 11. «Скарына і сёння служыць свайму народу».

**2. Мяркуемая аўдыторыя.**

Наведвальнікамі музея будуць жыхары і грамадзяне Рэспублікі Беларусь і іншых краін. Гэта: студэнты і навучэнцы, школьнікі, работнікі разнастайных сфер і прадпрыемстваў культуры, навуковыя работнікі і вучоныя, інтэлігенцыя, усе работнікі разумовай працы, найбольш адукаваныя і патрыятычна настроеныя рабочыя і сяляне, вяскоўцы і гараджане. Па сутнасці – увесь беларускі народ і прадстаўнікі іншых усходне-славянскіх, славянскіх і неславянскіх народаў. Недахопу наведвальнікаў музей ніколі мець не будзе, таму што яго аўдыторыяй будзе, па сутнасці, увесь беларускі народ і прадстаўнікі суседніх і ўсіх славянскіх народаў.

**V. Асноўныя патрабаванні да мастацкай канцэпцыі.**

На выпадак размяшчэння такога музея ў нашым універсітэце мастацкая канцэпцыя ўжо існуе.

У мастацкай канцэпцыі акрамя мастацкага эскіза памяшкання і экспазіцыйнага абсталявання ёсць і чарцяжы для вырабу іх. Кожны экспанат будзе ў мастацкай форме падпісаны, маляўніча аформлены раздзелы экспазіцыі, у жывапіснай ці графічнай форме ўзноўлены адсутныя ў фондах музея творы выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Асабліва недасягальныя будуць прадстаўлены ў муляжах. Усе кнігі Скарыны будуць прадстаўлены ў факсімільных выданнях, надрукаваных у Рэспубліцы Беларусь у год 500-годдзя беларускага кнігадрукавання. Будуць у мастацкай форме выкананы плакаты, стэнды, графікі, геаграфічныя карты, асноўныя архітэктурныя будынкі тых гарадоў, у якіх Скарына жыў, працаваў ці бываў па сваіх справах; распрацаваны і аформлены розныя падстаўкі і таблічкі ў залежнасці ад таго, якія экспанаты будуць выбраны для размяшчэння ў экспазіцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Абгрунтаванне павышэння статуса музея-лабараторыі Ф. Скарыны.**

У выпадку, калі дзяржавай не будзе прынята рашэнне аб будаўніцтве і арганізацыі Беларускага музея Францыска Скарыны, неабходна павысіць статус музея-лабараторыі Ф. Скарыны хоць бы да абласнога, назваўшы яго «Гомельскі абласны музей-лабараторыя Францыска Скарыны», і арганізаваць у ім сапраўдную музейную скарынаўскую экспазіцыю. У фондах цяперашняга музея-лабараторыі маецца мастацкая канцэпцыя, чарцяжы тагачаснага друкарскага станка, шмат перавыданняў кніг Скарыны, шматлікая навуковая і мастацкая літаратура, творы выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Для афармлення новай экспазіцыі музея-лабараторыі можна выкарыстаць дапамогу і матэрыялы беларускага самадзейнага майстра Ліхадзедава Уладзіміра, які асвоіў тэхналогію скарынаўскага кнігадрукавання, вырабіў аналаг скарынаўскага друкарскага станка, асвоіў выраб такой паперы, на якой друкаваў Скарына, і надрукаваў поўныя аналагі некалькіх кніг Скарыны.

Адкрыццё дзяржаўнага музея (ці, яшчэ лепш: музея-лабараторыі) Францыска Скарыны стане (на завяршэнне паўторым) самым лепшым помнікам нашаму першадрукару, гэта ўстанова ўсяго толькі праз 1 год свайго існавання стане сусветным цэнтрам скарыназнаўства [10, с. 11–14] і нават своеасаблівай візітнай карткай нашай дзяржавы. Ён стане і высокім гонарам Рэспублікі Беларусь!

## Літаратура

1. Усовіч, К. Музею-лабараторыі Ф.Скарыны – дзяржаўны статус / К. Усовіч // Гомельскі універсітэт. – 1996. – 8 кастрычніка. – С. 3.

2. Усовіч, К.С. Да навуковай канцэпцыі музея-лабараторыі Ф. Скарыны // К.С. Усовіч, І.І. Талецкая-Кавальчук // «Музей і традыцыйная культура Беларусі» : мат. Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Гомель, 17–18 мая 2011) / рэдкал. : С.В. Разанаў (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2011. – 92 с.

3. Франциск Скорина и его время: энциклопедический справочник / Белорус. Сов. Энциклопедия ; Редкол. : И.П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелСЭ, 1990. – 631 с.: ил.

4. Чарняўская, Д. Натхнёныя першадрукаром : Які́м мог бы быць музей Францыска Скарыны? / Д. Чарняўская // Літаратура і мастацтва. – 2017. – 29 снежня. – С. 5.

5. Владимиров, Л.И. Всеобщая история книги: Древний мир. Средневековье. Возрождение. XVII век / Л.И. Владимиров. – М. : Книга, 1988. – 312 с.

6. Йончев, В. Книга през вековете / В. Йончев. – Първо издание. – София : Български художник, 1976. – 415 с.

7. Книжные сокровища мира: Из фондов Государственной библиотеки СССР имени В.И. Ленина / Сост. Е.И. Левит. – М. : Книжная палата, 1989. – Вып. 1. – 223 с. (на знешніх пашыраных палях артыкула Алега Мрамарнава «Кніжнік» XVII ст. змешчаны: на с. 54 – фота «Малой падарожнай кніжкі», на сс. 54 – 55 – кароткія звесткі пра Ф. Скарыну).

8. Францыск Скарына : энцыклапедыя / рэдкал. : У.У. Андрыевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017. – 568 с.: іл.

9. Принципы построения музейной экспозиции // Электронный ресурс. – Режим доступа : http://mydocx.ru/10-59574.html. – Дата доступа : 07.08.2017.

10. Усовіч, К. Каб стаць сусветным цэнтрам скарыназнаўства / К. Усовіч // Кантакты і дыялогі : інфармацыйна-аналітычны і культуралагічны бюлетэнь МАБ і Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі. – 1998. – № 5. – С. 11–14.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 17.09.2017

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ